Чацвер, 25 Лістапад 2021

Паўтара года «хіміі» – за скамечаны і выкінуты ў сметніцу дзяржаўны сцяг

Друкаваць (/news/sud/item/4294-pautara-goda-khimii?tmpl=component&print=1) | Эл. пошта (/component/mailto/?tmpl=component&template=lt_news&link=56e6b723e20a434bcf63f36c3740e8b818db3ae9)

Ацаніць гэты матэрыял (2 галасоў)



(/media/k2/items/cache/8f878ea0803189dcd4867928ffaf1eb9_XL.jpg)

Афіцыйны сцяг на будынку СІЗА ў Віцебску. Фота мае ілюстрацыйны характар

25 лістапада суд Першамайскага раёну Віцебску абвясціў рашэнне ў крымінальнай справе паводле артыкулу 370 КК РБ («Здзек над дзяржаўнымі сімваламі»). Суддзя Алена Жук прызнала 26-гадовага Дзмітрыя Карпінскага вінаватым у знеслаўленні афіцыйнага сцягу і прысудзіла мужчыну да 1 года і 6 месяцаў абмежавання волі. Першае паседжанне адбылося **(/news/sud/item/4291-skamyachyu-getae-palotnishcha)** 23 лістапада.

Віцябляніна **Дзмітрыя Карпінскага** абвінавачвалі ў тым, што ён уначы з 8-га на 9-га верасня, знаходзячыся побач з крамай «Веста» у мікрараёне Білева, зняў з будынку афіцыйны сцяг, а пасля, сарваўшы з дрэўка, скамячыў яго і выкінуў у сметніцу. Па версіі

следства, сваімі дзеяннямі ён зняславіў дзяржаўны сцяг. Пры гэтым – праяўляў «дзёрзкія паводзіны» і «паказную смеласць», «непаважлівае стаўленне да дзяржаўных сімвалаў».

Віну хлопец прызнаў часткова, заявіў, што не хацеў здзекавацца над сцягам, толькі хацеў ад яго пазбавіцца.

Суддзя **Алена Жук** прыняла рашэнне Дзмітрыя Карпінскага «прызнаць вінаватым і на падставе артыкулу 370 КК РБ прызначыць пакаранне ў выглядзе абмежавання волі на тэрмін 1 год 6 месяцаў з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу».

Тэрмін адбывання пакарання будзе адлічвацца з дня пастаноўкі на ўлік у папраўчай установе. У дадзены момант Дзмітрый знаходзіцца пад падпіскай аб нявыездзе. Тры дні, з 15 па 18 верасня, якія ён адбыў у ізалятары, будуць залічаныя ў тэрмін з разліку адзін дзень у ізалятары роўны двум дням на «хіміі».

Прысуд не набыў законнай моцы і можа быць абскарджаны ў абласным судзе. Дзмітрый яшчэ не вырашыў ці будзе абскарджваць прысуд, бо не мае надзеі, што абласны суд перагледзіць рашэнне і зменшыць пакаранне.

Пасля абвяшчэння прысуду, Дзмітрый Карпінскі выказаў жаданне, каб далёка ад Віцебску яго не адпраўлялі.

Уладзімір Бяляўскі

Апублікавана ў Суд (/news/sud)
Тэгі: артыкул 370 КК (/itemlist/tag/артыкул%20370%20КК) Алена Жук (/itemlist/tag/Алена%20Жук) Дзмітрый Карпінскі (/itemlist/tag/Дзмітрый%20Карпінскі)

Яшчэ ў гэтым разьдзеле: « «Скамячыў гэтае палотнішча і выкінуў яго». Віцябляніна судзяць за здзек над афіцыйным сцягам (/news/sud/item/4291-skamyachyu-getae-palotnishcha) 45-гадовага прадпрымальніка судзяць за абразу Сяргея Сташэўскага, які прымушаў падрабляць пратаколы » (/news/sud/item/4295-za-abrazu-syargeya-stasheuskaga)

Вярнуцца ў пачатак (/news/sud/item/4294-pautara-goda-khimii#startOfPageId4294)

© 2011 - 2024 Віцебская вясна (/). Пры выкарыстаньні матэрыялаў абавязковая гіпэрспасылка. Email: vitebskspring@proton.me (mailto:vitebskspring@proton.me)

(Https(/